# ПРАСТОРА ТВОРЧАСЦІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ


Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Саюз пісьменнікаў Беларусі сёлета адзначае сваё 90-годдзе. А заснавана творчая арганізацыя (тады пад назвай Саюз пісьменнікаў БССР) была ў Мінску на Усебеларускім з'ездзе пісьменнікаў у чэрвені 1934 года.**
**Свой юбілей Саюз пісьменнікаў Беларусі адзначае шэрагам разнастайных мерапрыемстваў. На адрас творчай арганізацыі працягваюць паступаць віншаванні. Самае галоўнае — ад кіраўніка дзяржавы, якое ўручыў учора прадстаўнікам творчай супольнасці намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

— Мы неаднойчы сустракаліся з вамі на розных мерапрыемствах. Правялі шмат канструктыўных круглых сталоў, выпрацавалі пэўныя падыходы, якія вы паспяхова на працягу ўсяго гэтага перыяду рэалізоўваеце, — звярнуўся ён да прысутных.

Сярод заснавальнікаў творчай арганізацыі некалі былі яркія майстры слова Якуб Колас, Янка Купала, Міхась Чарот, Кузьма Чорны, Змітрок Бядуля, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва... У шэрагах творчага аб'яднання сёння таксама шмат таленавітых літаратараў. Вядзецца актыўная работа па іх падтрымцы на розных узроўнях. Праходзяць прэзентацыі кніг, творчыя сустрэчы, арганізоўваюцца дыскусійныя клубы, ладзяцца разнастайныя конкурсы, дзе можна прадэманстраваць свае здольнасці і талент.

— 90-годдзе — гэта значная падзея ў культурным і літаратурным жыцці не толькі творчага саюза, але і ўсёй нашай краіны і міжнароднай супольнасці. Таму што ў нас вельмі плённыя, шырокія літаратурныя сувязі з многімі пісьменніцкімі арганізацыямі — Расіі, Кітая, іншых краін. І гэтыя творчыя сувязі выліваюцца ў пераклады, выданне сумесных зборнікаў, удзел у міжнародных фестывалях і г. д. Таму такая падзея — гэта яшчэ адна магчымасць падсумаваць тое, што зроблена, зазірнуць наперад і працаваць, працаваць далей на росквіт нашай літаратуры, культуры і краіны, — адзначае **старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Міхась ПАЗНЯКОЎ.** — Планы ў нас вялікія і па развіцці нацыянальнай літаратуры, і па пошуку юных таленавітых літаратараў. Пастаянна мы праводзім разнастайныя конкурсы, каб заахвоціць юных паэтаў, празаікаў, публіцыстаў. Сёлета яны прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Штогод праводзім конкурс «Славянскі калейдаскоп», прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Ёсць у нас літаратурны конкурс Міколы Мятліцкага, нашага класіка, які шмат зрабіў для нацыянальнай літаратуры. Гэты конкурс мы праводзім сярод маладых літаратараў, якія пішуць менавіта на беларускай мове. І на рускай мове ў нас пішуць многія таленавітыя майстры слова. І ўсё гэта ў суме — важкая частка нашай нацыянальнай культуры.

Адметнай ноткай сустрэчы стала таксама ўручэнне членскага білета СПБ маладому аўтару Лізавеце Бычыкавай (псеўданім Лізавета Саевіч). Дзяўчына працягвае пісьменніцкую дынастыю сваёй сям'і: яе дзядуля і бацька — таксама пісьменнікі.

— Уступленне ў Саюз пісьменнікаў Беларусі для мяне гэта — вялікі гонар. Мне прыемна, што мая праца была заўважана і высока ацэнена. Так склалася, што я працягваю пісьменніцкую традыцыю ў маёй сям'і, таму буду і надалей рабіць гэта годна і адказна, — адзначыла Лізавета.

Таксама дзяўчына заўважыла, што Саюз пісьменнікаў Беларусі дае вялікую падтрымку на старце для маладых літаратараў: «У гэтай супольнасці таленавітыя людзі знаходзяць штуршок для творчасці, дзякуючы чаму ў перспектыве многія пісьменнікі робяць упэўненыя крокі ў літаратуру».

**Алена ДРАПКО.**

# СВЯТА МІРУ І ЗГОДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Галоўнай стравай на польскім падворку сталі бігус, кішка, флякі, пончыкі. Дарэчы, раней бігус гатавалі 2-3 дні ў некалькі прыёмаў, каб капуста была мяккая, але цэлая. Лепш змяшаць свежую і кіслую. Добра дадаць вэнджаныя каўбаскі, тады страва набірае патрэбны смак.

Дарэчы, многія госці фестывалю адзначылі сёлета вялікую колькасць фудкортаў. Маштабная зона была створана на плошчы Леніна. Гродзенцы вырашылі не адставаць ад нацыянальных суполак і арганізавалі першы «смачны» фестываль «Галоўны па мясе». Наведвальнікі маглі пакаштаваць новую страву — «губерцікі» ў гонар Святога Губерта, ахоўніка горада Гродна. Магчыма, страва стане традыцыйнай.

## Багатае беларускае падвор'е

Самым вялікім на Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур стала беларускае падвор'е, куды прыехалі прадстаўнікі ўсіх абласцей і горада Мінска і прывезлі свае нацыянальныя здабыткі. Падчас адкрыцця другога дня фестывалю ўдзельнікі выходзілі з сімваламі абласцей. Напрыклад, для Гомельшчыны гэта ручнікі. Пляцоўка вобласці стала імітацыяй неглюбскай вясковай хаты.

Прыехала на свята і народны майстар Людміла Кавалёва са знакамітай вёскі. Веды і навыкі ткацтва яна пераняла ад носьбітаў. Жанчыну моцна ўразіла, што ў адной асобнай вёсачцы так многа адрозненняў, нават у параўнанні з суседняй. І гэта не толькі традыцыя ткацтва, але і спосаб нашэння вопраткі — адчувалася, што мясцовыя жанчыны імкнуліся падаваць сябе эфектна. Вялікі галаўны ўбор дадаваў невысокім нявестам росту, а накладкі пад андарак — аб'ёму. Цікава нават тое, як тут называлі ніткі і ўзоры. Так, ручнікі, у вырабе якіх шмат выкарыстоўвалася чорных нітак, называлі чарнабровымі, белых — бялёсымі. Прывезла Гомельшчына і практыкі саломапляцення, ткацтва паясоў. Беларускі падворак два дні знаёміў удзельнікаў і гасцей фестывалю з адметнымі традыцыямі, стравамі, рамёствамі, гульнямі, песнямі і танцамі, прайшло безліч майстар-класаў, да якіх далучаліся замежныя госці.

Падчас адкрыцця другога дня фестывалю са сцэны, усталяванай побач з беларускім падворкам, **міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль МАРКЕВІЧ** заўважыў, што гэта мерапрыемства сімвалізуе сабой узаемаразуменне, павагу, добразычлівасць і сяброўства:

— Свята гаворыць аб тым, што нашу сінявокую ведаюць, любяць не толькі беларусы, але і ўсе тыя людзі, для каго яна адкрывае магчымасці незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці.

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК** нагадаў, што сёння ў нашай краіне пражывае больш за 150 нацыянальнасцяў:

— Мы не дзелім нікога ні па нацыянальнасцях, ні па веравызнанні. Жывём адной сям'ёй. Так і сёння ў Гродне мы бачым, калі разам стаяць азербайджанцы і армяне, палесцінцы і яўрэі, таму што ў нас няма спрэчак, толькі згода. Наш Прэзідэнт аднойчы сказаў, што гэта адзін з самых вялікіх здабыткаў незалежнай Беларусі, таму давайце шанаваць, зберагаць тое, што ўмацоўвае нашу дзяржаву, наша грамадства.

Наогул, тэма сям'і і еднасці стала адной з ключавых на фестывалі, прычым як у глабальным сэнсе — як мір і згода, так і ў сэнсе захавання традыцыйных каштоўнасцяў, добрых узаемаадносін паміж сужэнцамі, бацькамі і дзецьмі. Адзін з вясельных абрадаў, унесены ў спіс нематэрыяльнай спадчыны, — традыцыю выпякання паўлаўскага каравая — прадэманстравала кіраўнік народнага фальклорнага калектыву «Чараўніцы-каравайніцы» са Слонімшчыны Дар'я Кірыенка. Цеста замешвала няцотная колькасць жанчын — абавязкова замужніх, якія мелі здаровых дзетак. Развядзёнкі і ўдовы да такой справы не дапускаліся. Працавалі яны ў чыстай новай вопратцы, каб у маладых усё склалася.

Паўлаўскі каравай багата аздабляўся. У цэнтры ставілася пладовая галінка з разгалінаваннем на пяць парасткаў (такую яшчэ, як тую кветку шчасця, паспрабуй адшукай). Галінка пэўным чынам высушвалася, абляплялася цестам і запякалася. Каб у маладых нарадзілася багата дзетак, каравай упрыгожваўся птушкамі. Кветкі гаварылі пра прыгажосць маладой. Падкоўкі — на шчасце, вароты — каб у новую сям'ю ўвайшло каханне ды шчасце. Васьмёркі як сімвал бясконцага кахання, каласкі — на багаты ўраджай, пацеркі, кожная з якіх выпякалася як асобная, — пажаданне багацця. Прычым усе гэтыя дэталі выпякаліся асаблівым чынам, не ў духу, як звычайна прынята, а перад полымем.

Віцебскую вобласць прадстаўляла сям'я Рымдзёнкаў: жонка займаецца ткацтвам, бацька і сын — ганчарствам. Падчас фестывалю яны паказвалі майстар-класы па вырабе свістулек і берасцянікаў (посуду, апleценага бяростай). Традыцыя па вырабе апошніх нядаўна атрымала статус нематэрыяльнай каштоўнасці. Гаршкі, пераплеценыя бяростай, менш біліся пры перавозцы. Яны, як тэрмасы, захоўваюць тэмпературу прадуктаў. Загадчыца Шаркаўшчынскага раённага цэнтра культуры Вікторыя Дубоўская падзялілася, што ў рэгіёне працягваюць традыцыі маляваных дываноў, распачатыя Язэпам Драздовічам. Прычым яшчэ з 1980-х гадоў такія веды перадаюцца мясцовым майстрам, і сёння з самымі маленькімі мастакамі працуе кіраўнік студыі мастацкіх рамёстваў Святлана Заіка, якая расказала, як наносіць фарбы на тканіну, каб яны былі больш яскравымі, насычанымі.

Аляксандр Свірыд, разьбяр-самавучка з Ганцавіч, марыць перадаць свае ўменні вучням. А гэты чалавек умее настолькі складаныя і далікатныя вырабы выразаць з дрэва, што яго работы ідуць на падарункі розным паважаным гасцям, і часта іх вывозяць за мяжу — у Еўропу, Азію, Амерыку. Ён сам прыдумляе выгляд будучага вырабу, малюе трафарэты на паперы, а пасля вылічвае, каб падчас выразання не саступіць ні на міліметр. Ніводны ўзор не паўтараецца.




У фестывалі бралі ўдзел і беларусы замежжа — з Расіі, Латвіі і Польшчы. Так, на беларускім падворку сваю канцэртную праграму прадставілі народны калектыў «Арляня» з Беласточчыны і ансамбль беларускай песні «Завіруха» з Рыгі. Вялікую канцэртную праграму «Бывайце здаровы, жывіце багата!» падрыхтавалі госці з Томска, адкуль прыехалі два калектывы: ансамбль беларускай песні «Медуніца» і народны вакальны ансамбль «Белая Русь».

## «Усе мы тут — родныя»

Фестываль стаў не проста культурным брэндам горада над Нёманам, але і асаблівым сімвалам адзінства, міру і згоды. Яркая і непаўторная, маляўнічая і каларытная, маштабная і захапляльная старонка чарговага свята ўпісана не толькі ў гісторыю Гродзеншчыны, але і ўсёй Беларусі. Прадстаўнікі суполак падзяліліся думкамі аб самой ідэі фестывалю.

— Тым, хто яго прыдумаў, я помнік устанавіў бы! Гэта вельмі шыкоўная ідэя! Мы два гады яго чакаем, не можам дачакацца. Удзячныя, што можам паказаць свае традыцыі, культуру. Мы прадстаўнікі Азербайджана і дзеці Беларусі. Гэта дружба народаў важная. Лічым, што Беларусь — самая талерантная краіна, — упэўнены намеснік прадстаўніка Кангрэса азербайджанскіх суполак Алег Бадалаў.

— Адчуваем вялікую падтрымку ў Беларусі, — расказаў старшыня афганскай дыяспары Саід Мухамед. — Беларусы — вельмі добры народ, культурны. Дзякуючы палітыцы краіны, нас тут прынялі, стварылі ўмовы для жыцця, жывём у міры і спакоі, вельмі ўдзячны за гэта.

— Галоўная ідэя фестывалю і галоўная думка кожнага нармальнага чалавека, што ўсе мы — родныя, — эмацыянальна заўважыла прадстаўніца казахскай дыяспары Гульнара Жармедзетава.

Чарговы, XIV, фестываль нацыянальных культур стаў гісторыяй, зазначыў падчас урачыстага закрыцця форуму міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч.

— Гэта былі два незабыўныя дні. Мы яшчэ больш даведаліся пра спадчыну мноства краін. Вельмі прыемна, што ў нашай шматнацыянальнай краіне кожны народ жыве паўнавартасным жыццём, ведае гісторыю, гадуе дзяцей і вельмі ўпэўнена глядзіць у будучыню. Таму што мы адна дружная сям'я, мы грамадзяне Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў Анатоль Маркевіч.

Міністр культуры падзякаваў усім нацыянальным аб'яднанням, усім людзям, якія падарылі гасцям і жыхарам Гродна цудоўны настрой. Ён выказаў упэўненасць, што зарад бадзёрасці, які быў атрыманы падчас свята, будзе саграваць усіх да наступнага, юбілейнага, XV фестывалю. Чакаць засталося ўсяго два гады.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ,**
**фота аўтараў.**

# Узлёты, падзенні і... парушэнні

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле інфармацыі Мінадукацыі, сярэднія паказчыкі па ўсіх вучэбных прадметах перавысілі лічбу 50. Сярэдні бал па матэматыцы, напрыклад, склаў 54,8, хіміі — 63,8, гісторыі Беларусі — 64,2, грамадазнаўстве — 60,9. Ад 20 да 35 працэнтаў выпускнікоў, якія на ЦЭ атрымалі адзнакі «9» і «10», пацвердзілі свае вынікі атэстацыі па вучэбных прадметах у школе.

А цяпер пра сумнае. Па інфармацыі Камітэта дзяржаўнага кантролю, у Беларусі з цэнтралізаванага экзамену былі выдалены дзевяць чалавек: тры выпускнікі за пранос мабільнага тэлефона, трое былі са шпаргалкамі і яшчэ траіх выдалілі па іншых прычынах. Па выніках першага дня цэнтралізаванага тэсціравання за парушэнні былі выдалены чатыры абітурыенты. Пры гэтым шпаргалкамі, напісанымі на руках і іншых частках цела, скарыстацца абітурыентам не ўдалося, але іх наяўнасць стала падставай для адхілення ад цэнтралізаванага іспыту.

Таксама КДК адзначыў, што магчымасць скарыстацца забароненымі прадметамі вывучаецца і пасля завяршэння цэнтралізаванага выпрабавання праз маніторынг сеткі Інтэрнэт на прадмет размяшчэння на тых ці іншых рэсурсах фатаграфій, зробленых у аўдыторыі падчас выпрабавання.

Мы пацікавіліся, як праходзіў і з якімі вынікамі скончыўся першы дзень цэнтралізаванага іспыту ў школах. На сувязі — **дырэктар ДУА «Гімназія № 5 г. Мінска імя герояў сустрэчы на Эльбе» Жанна ГВОЗД:**

— Як кіраўнік установы адукацыі я вельмі задаволена вынікамі першага дня цэнтралізаванага экзамену. У нас два стабальнікі, двое вучняў здалі тэст на 99,9 бала. Вялікая колькасць выпускнікоў атрымалі за іспыты дзявяткі і дзясяткі. Прычым у большасці адзнакі, выстаўленыя вучням па выніках года, супалі з адзнакамі па ЦЭ. Настрой у вучняў быў добры, пазітыўны. Арганізацыя — на высокім узроўні. Чарговы раз пераконваюся ў правільнасці выбару такой ацэнкі ведаў. Задаволены дзеці, іх настаўнікі і бацькі — усё справядліва і празрыста. Ды і рэпетыцыйны экзамен адыграў сваю станоўчую ролю. Школьнікі ведалі, што іх чакае, былі падрыхтаваны да гэтага, і ім заставалася толькі паспяхова выканаць заданні.

Дзевяцікласнікам прыйшлося нялёгка — як і год таму, выпускнікі базавай школы трымалі чатыры экзамены: пісьмовая кантрольная, а таксама пераказы па рускай і беларускай мовах. Гісторыю Беларусі здавалі ў вуснай форме па білетах, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі. Але ў іх усё атрымалася.

6 чэрвеня ў краіне прайшло цэнтралізаванае тэсціраванне па грамадазнаўстве, хіміі, фізіцы і гісторыі Беларусі. У іспыце прынялі ўдзел больш за 28 тысяч абітурыентаў. Былі створаны ўсе ўмовы для паспяховай работы над тэстамі: падвоз, прапускны і пітны рэжымы, прысутнасць медыкаў, кантроль за мікракліматам у памяшканнях.

## ХТО НЕ ПАСПЕЎ, ТОЙ НЕ СПАЗНІЎСЯ

Тыя выпускнікі, якія не змаглі ўзяць удзел у цэнтралізаваным іспыце ў асноўныя тэрміны, змогуць прайсці яго ў рэзервовыя дні. У бягучым годзе прадугледжаны рэзервовыя дні правядзення ЦЭ 21 і 23 чэрвеня, якія сумешчаны з рэзервовымі днямі цэнтралізаванага тэсціравання. Такім чынам, усе навучэнцы змогуць атрымаць атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі і ва ўстаноўленым парадку ўдзельнічаць у конкурсе для залічэння ва ўстановы вышэйшай адукацыі. Ёсць і іншыя тэрміны — 19 і 21 жніўня. У гэты час іспыты будуць здаваць тыя, хто раней па ўважлівых прычынах не змог на іх прысутнічаць, у тым ліку ў рэзервовыя дні. Сюды таксама ўвайшлі парушальнікі правіл паводзін у аўдыторыі.

Аб выніках ЦТ можна будзе даведацца на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Свой сертыфікат абітурыент атрымае ў пункце, дзе праходзіў выпрабаванне. Прычым пад подпіс пры прад'яўленні асабістага дакумента, з якім ён праходзіў ЦТ, дакумента аб адукацыі і пропуску з адзнакай «Тэсціраванне прайшоў».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

# ПАД ЗНАКАМ АЙЧЫННАГА «ЗОЛАТА»




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Стартавалі святочныя мерапрыемствы з урачыстага шэсця пад жывую музыку, у якім узялі ўдзел каля тысячы прадстаўнікоў прадпрыемстваў, тэатраў моды, устаноў адукацыі раёна. Уверцюрай да фестывалю стаў канцэрт з удзелам юных талентаў Аршанскага раёна, а працягнуў праграму канцэрт творчых калектываў Віцебскай вобласці «Да нас госцейкі прыехалі». Пляцоўку па душы і інтарэсах змог знайсці кожны жыхар і госць Оршы: арганізатары запрашалі ўсіх ахвотных на гастрашоу, выставу работ мастацкага праекта «Рай», fashion-конкурс, паказ калекцый ад аматарскіх тэатраў моды Беларусі, квэст па гісторыі льнаводства. Вялікія рады своеасаблівага горада майстроў запрашалі на розныя майстар-класы, у ліку якіх — амаль поўны цыкл апрацоўкі лёну ад кветачкі да ніткі. Падворкі прадпрыемстваў раёна ў рамках гастрашоу прапаноўвалі незвычайныя кулінарныя вынаходніцтвы, абавязковым элементам якіх быў лён: печыва, кісель, мясныя вырабы.

На галоўнай сцэне адбылася цырымонія ўрачыстага адкрыцця, падчас якой да жыхароў і гасцей горада з віншавальным словам звярнуўся **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.** «Мы сёння закладваем новую традыцыю Аршанскага рэгіёна, упершыню так маштабна прэзентуем новы брэнд. Льнаводы — гэта людзі, вартыя вялікай павагі. Лён няпроста як вырасціць, так і перапрацаваць, атрымаць з яго прадукцыю. Лён — «залатая» для нас культура, наш брэнд, наш гонар», — падкрэсліў Аляксандр Міхайлавіч. Кіраўнік вобласці абвясціў падзякі за шматгадовую плённую працу ў лёгкай прамысловасці, высокі прафесіяналізм і асабісты ўклад у развіццё галіны аператару паточнай лініі фабрыкі 1 Таццяне Земляной, ткачу фабрыкі 3 Аршанскага льнокамбіната Алене Крэс.

Не засталіся без заслужаных узнагарод і астатнія работнікі льнокамбіната, іх прафесіяналам сваёй справы ўручыла кіраўніцтва прадпрыемства. Разынкай новага фестывалю стала насычаная вячэрняя праграма і бітбокс-шоу барабаншчыкаў. Самы масавы танцпол пад адкрытым небам плошчы калегіума езуітаў у Оршы сабралі хэдлайнеры фестывалю — гурт «Горад 312» і «Filatov & Karas». Яркім фінальным акордам першага фестывалю беларускага лёну стаў святочны салют.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**


## Извещение о проведении

**повторного открытого аукциона по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей земельного участка в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом (срок консервации истек) с инв. № 203/U-50902 (фундамент – фундаментные блоки, площадь застройки – 81 кв. м, процент готовности – 10 %) и земельный участок с кадастровым № 225883705101000029 площадью 0,2500 га в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по адресу: Витебская обл., Шумилинский р-н, Николаевский с/с, д. Ерашово, 35. Ограничения: водоохранные зоны водных объектов вне прибрежных полос (р. Сечна).

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/ зем. участок): **13057,75** (11732,75/1325,00) бел. руб. **Задаток:** 1305,77 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 89,85 %.

**Дата, время и место проведения аукциона: 17.07.2024 в 15.00** по адресу: Витебская обл., г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 18.09.2023 до 13.00 16.07.2024. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Задаток перечисляется на р/с: BY97 AKBB 3604 3310 5500 0200 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300988841, код операции 40901. Получатель платежа: Николаевский сельисполком. Условия для победителя аукциона либо претендента на покупку:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для проведения аукциона; обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в организацию по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта; разработать проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 6 месяцев с даты осуществления государственной регистрации права на земельный участок; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство жилого дома в сроки, установленные Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 87. **Назначение земельного участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220.** Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ), которые в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Предоставляются: гражданином РБ – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина РБ – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе и доверенность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении каждого предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией (тел. (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63), а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. Конт. тел. (29) 2186868

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

***ОАО «Н Холдинг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР» с понижением стоимости на 10 %***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | **Изолированное помещение с инв.500/D-708168906**, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стадионная, 5-102 на 1-ом этаже многоквартирного жилого дома. **Площадь – 54,1 кв. м.** Наименование – **административное помещение**. Назначение – административное помещение. Объект недвижимости обременен договором аренды | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **154 440,00** | **Задаток, BYN** | **7 722,00** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения о продавце, его местонахождение** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР» 220029, г. Минск, ул. Красная, 7, комн. 4 Email: info@hbd.by | | | | |
| Сведения об организаторе аукциона | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 044 580 63 02 (Александра) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 19 июня 2024 года (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **21 июня 2024 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул.Куйбышева, д.35, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона

**Лот № 1:** легковой седан «МАЗДА 6», год выпуска 2003 г., кузов № JMZGG123231150134, регистрационный знак 1084 АВ-1

| | | | |
|---|---|---|---|
| Начальная цена, руб. (без НДС) | 9 938,59 | Размер задатка, руб. | 993,86 |

Продавец: государственное учреждение «Брестская областная государственная инспекция по семеноводству, карантину и защите растений», 224001, г. Брест, ул. Северная, 13/1, тел./ф 80162542059. Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи. Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона. Срок возможного отказа от проведения аукциона: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 16 июля 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 15 июля 2024 г. до 17.00